I2. Важнейшым напрамкам у працы публічных бібліятэк з'яуляецца прапаганда здароуя. Мы вывучалі вопыт і працу бібліятэк "здароуя і дабрадзейнасці" ЗША і лічым гэта найбольш перспектыўным напрамкам бібліятэрапіі.

I3. На наш погляд, чытач, збіраючыся самастойна умацаваць свае здароуе, павінен прачытаць вызначанае кола твораў і зрабіць асабісты індывідуальны план аздараулення. Затым не меньш 2-3 разоў у нядзелю чытаць літаратуру па гэтай тэме, якая заражала б яго аптымізмам і ведамі. Далей, штодзенна, з дапамогай псіхатрэнінга ен закрапляе ідэі, узятыя з кніг і умацоўвае сваю волю, таксама штодзенна вядзе дзеннік самакантролю. Гэта методыка, у вытворчасці, неаднаразова прыносіла поспех.

I4. На наш погляд, мае сэнс азнаеміць з асновамі бібліятэрапіі студэнтаў бібліятэчнага факультэта, а таксама медыцынскіх інстытутаў і Акадэміі фізічнай культуры Рэспублікі Беларусь.

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ АДУКАЦЫІ ЗША

Т.В.Шабельнік

Інфармацыйная прафесія змяняецца і пашыраецца з надзвычайнай хуткасцю. Каля 60 тысяч новых назвау кніг публікуецца у ЗША кожны год. У Злучаных Штатах за апошнія 40 гадоў колькасць бібліятэк усіх тыпаў і відаў павялічылася у 4 разы. Колькасць публічных бібліятэк налічвае каля 9 тысяч і 65000 філіялаў. Спецыяльных жа бібліятэк увогуле налічваецца каля II4 тысяч.

Больш палові працоўных рэсурсаў ЗША занята вытворчасцю, апрацоўкай і распаўсюджваннем інфармацыі. Усе больш патрабуецца абучаны персанал з вопытам прадбачання, тэхнічным вопытам і здольнасцямі арганізатара.

На сенняшні дзень у вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ЗША вылучаюць 3 ступені: бакалаура, магістра і доктара. У айчыннай вышэйшай адукацыі гэтыя ступені адпавядаюць чатырохгадоваму навучанню без абароны дыплома пяцігадоваму навучанню з абаронай дыплома і аспірантуры з абаронай кандыдацкай дысертацыі. Вышэйшая бібліятэчная адукацыя складае частку універсітэцкай,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а не проста прафесійную адукацыю. У ЗША, каб стаць прафесійным бібліятэкарам або інфармацыйным работнікам, неабходна атрымаць ступень магістра бібліятэчных або інфармацыйных навук. Для атрымання больш высокай кваліфікацыі лепш скончыць бібліятэчную школу, якая атрымала акрэдытацыю Амерыканскай Бібліятэчнай Асацыяцыі.

У цяперашні час у ЗША існуе каля 100 бібліятэчных школ. 60 з іх маюць праграмы на ступень магістра, акрэдытаваныя АБА. Крыніцамі фінансавання такіх школ з'яўляюцца: універсітэт, студэнцкая плата за навучанне, ахвяраванні.

Набор студэнтаў у школы бібліятэчных і інфармацыйных навук здзяйсняецца на працягу ўсяго вучэбнага года, так як навучанне можна пачаць у любым семестры. Выбар кандыдатаў для навучання ў Школе бібліятэчных навук пры Калумбійскім універсітэце здзяйсняецца на аснове стандартных патрабаванняў: 1) выдатны дыплом аб сканчэнні вучэбнай установы; 2) адукацыйны ўзровень кандыдата вылічваецца на аснове ўсіх прадметаў па 4-х бальнай сістэме. Улічваюцца прадпасылкі да патэнцыяльнага поспеху ў выбранай спецыяльнасці, што вызначаецца з рэкамендацыйных пісьмаў па меншай меры 3-х выкладчыкаў, навуковых кіраўнікоў або другіх асоб, якія здольны вызначыць узровень ведаў кандыдата на навучанне. Каб правільна ацаніць абітурыентаў, якія не заўсёды адпавядаюць стандартным патрабаванням, існуюць спецыяльныя крытэрыі допуску, такія, як: 1) сацыяльна-эканамічная падрыхтоўка; 2) незвычайна высокая таленавітасць; 3) больш глыбокая падрыхтоўка ў вызначаных галінах ведаў; 4) добры вопыт працы ў бібліятэчнай справе; 5) веданне замежных моў; 6) веданне матэматыкі, статыстыкі, логікі, камп'ютэрнай справы; 7) магчымы будучы ўклад кандыдата ў вучэбнай або прафесійнай дзейнасці.

Каб даць магчымасць сваім выпускнікам прыставаца да змяняючагася рынку працы, школы бібліятэчных і інфармацыйных навук прапаноўваюць розныя варыянты навучання. У гэтых адносінах сістэма навучання ў Калумбійскім універсітэце з'яўляецца дастаткова тыповай.

Школа бібліятэчных навук пры Калумбійскім універсітэце прапануе разнастайныя праграмы навучання на ступень магістра, так і розныя праграмы прадзвінутага навучання, уключаючы



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

праграму на ступень доктара бібліятэчных навук. Навучанне па праграме магістра пачынаецца з 5-ці неабходных курсаў, якія з'яўляюцца асновай для спецыялізаваных праграм навучання. Гэта наступныя курсы: I) уводзіны ў бібліятэчную і інфармацыйную навукі; 2) уводзіны ў даследчую працу ў галіне бібліятэчных і інфармацыйных навук; 3) уводзіны ў інфармацыйныя службы; 4) элементы камп'ютэрнай і камунікацыйнай тэхналогіі; 5) уводзіны ў бібліяграфічны кантроль. Па завяршэнні 5-ці неабходных курсаў кожны студэнт павінен здаць вычарпальны экзамен. Затым выбіраецца праграма навучання. Ёсць I2 праграм навучання: I) вучэбнае і навуковае бібліятэказнаўства; 2) арганізацыя і кіраванне архівамі; 3) бібліяграфічны кантроль; 4) праграма па захаванасці; 5) інфармацыйная навука і інфармацыйныя сістэмы; 6) інфармацыйныя службы; 7) арганізацыя і кіраванне; 8) бібліятэказнаўства музыкі; 9) рэдкія кнігі і спецыяльныя калекцыі; I0) спецыяльныя бібліятэкі і інфармацыйныя цэнтры; II) грамадскае бібліятэказнаўства; I2) кіраванне захаванасцю. Увогуле кожная праграма навучання патрабуе 4 або 6 спецыялізаваных курсаў. Студэнты, якія зацікаўлены ў вызначаных галінах бібліятэчных навук, могуць падаць заяву на праграму, якую яны ўзгадняюць індывідуальна з дэканам.

Уся праграма дзеннага аддзялення аптымальна павінна быць пройдзена за 4 семестры. Можна яе прайсці за 3 семестры з летняй сесіяй. Усе патрабаванні на ступень магістра павінны быць выкананы на працягу 5 гадоў, выключаючы тыя выпадкі, калі студэнт мае уважлівую прычыну з-за хваробы або па дазваленню дэкана. У такіх выпадках праграма навучання можа быць прадоўжана да 6 гадоў.

Такім чынам, прынцыпіяльная розніца сістэм адукацыі ў ЗША і нашай Рэспубліцы не выключае наяўнасці прыемаў і сродкаў, якія могуць выкарыстоўвацца ў практыцы падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў. І зусім заканамерным з'яўляецца зварот нашых спецыялістаў да аналізу пастаноўкі прафесійнай бібліятэчнай адукацыі за мяжой, у тым ліку ў ЗША.